## СЯЛЯНСКАЕ САМАКІРАВАННЕ У БЕЛАРУСІ НАПЯРЭДАДНІ РЭВАЛЮЦЫІ 1905–1907 гг.

*С. А. Талмачова, г. Мінск*

Невырашанасць аграрнага пытання была адной з важкіх прычын рэвалюцыі 1905–1907 гг. Рэформа 1861 г. паклала пачатак новаму уладкаванню памешчыцкіх сялян. Пазней яе палажэнні адносна фарміравання і дзейнасці органау сялянскага самакіравання былі распаусюджаны і на іншыя катэгорыі сялянства. Карэнны пераломам у арганізацыі і функцыяніраванні органау сялянскага самакіравання значна пауплывау не толькі на самаарганізацыю сялянства, але і на палітычную і сацыяльна-эканамічную жыццядзейнасць вёскі.

Сістэма сялянскага саслоунага самакіравання, па задумцы аутарау "Палажэння 19 лютага 1861 г.", стваралася для падрыхтоукі сялян да удзелу ва усесаслоуных органах мясцовага самакіравання. Аднак у беларускіх губернях па палітычных прычынах земскае самакіраванне, што уводзілася ва унутраных губернях у адпаведнасці з земскай рэформай 1864 г., не было створана да пачатку XX ст. Гэта абумовіла большую аддаленасць беларускага сялянства ад агульнаграмадскага жыцця краіны, аднак не пазбавіла яго магчымасці самастойна вырашаць многія свае праблемы.

На працягу парэформенных дзесяцігоддзяу канкурыравалі і перапляталіся паміж сабой тры галоуныя фактары у дзейнасці сялянскага самакіравання. Гэта, па-першае, заканадауства 1861 г., па-другое, яго ажыццяуленне і далейшая урадавая палітыка і, па-трэцяе, адносіны самога сялянства, яго ментальнасць, здольнасць выкарыстоуваць як звыклыя для яго рычагі абшчыннай дэмакратыі, так і новыя магчымасці, дадзеныя рэформай 1861 г. Змены, што адбываліся ва усведамленні сялян, адлюстраваліся у з'яуленні новых псіхакласау у сялянскім асяроддзі і паступовым павелічэнні іх уплыву сярод аднаабшчыннікаў. Гэта азначае, што унутры сялянства паступова фарміравалася група тых, хто згаджауся з традыцыямі і быу гатовы да іх ломкі. Новае пакаленне пераважна складалася з тых, хто нарадзіуся пасля адмены прыгону, і часткова з насельніцтва, ахопленага адыходніцтвам. Напрыклад, у 80-я гады XIX ст. на 1 тыс. сельскага насельніцтва 5 заходніх губерняу выдавалася штогод у сярэднім 48 часовых пашпартау і адпускных білетау, у 90-я гады – ад 60 да 83 [1]. Толькі у беларускіх паветах Віленскай губ. валаснымі прауленнямі у 1893–1895 гг. было выдадзена 27.095 пашпартау адыходнікам [2]. Сказанае не азначае, што гэтыя сяляне поунасцю адмаулялі вопыт старэйшых, але яны лягчэй прыстасоувалісся да новых умоу жыцця, часцей пры магчымасці выкарыстоувалі новыя, больш прагрэсіуныя способы гаспадарання, адмаулялі патрыярхальны лад жыцця і імкнуліся да самастойнасці. Мінскі губернатар у 1894 г. дакладвау Міністру унутраных спрау, што "маладое пакаленне паступова ужо пачынае выказваць свавольства і непаслушэнства"[3]. У справаздачы за 1898 г. Віленскі генерал-губернатар адзначау, што пакаленне сялян, якое было сучаснікам рэформы 1861 г., "жыло яшчэ пад уплывам былога уладкавання, якое не дапушчала яго да свавольства, ...а цяперашняе пакаленне не стрымліваецца моцнай мясцовай уладай і ужо не адчувае ніякага знешняга уціску"[4].



Найбольш яскрава гэты працэс праявіуся у дзейнасці сельскіх і валасных сходау, пры вырашэнні складаных пытанняу, якія пастаянна з'яуляліся у жыцці сельскага вобшчаства і воласці і патрабавалі ад сялян выкарыстання новых падыходау. З цягам часу спрэчныя пытанні сталі вырашацца не агульнай згодай, а большасцю галасоу. Службовыя асобы сялянскага самакіравання набывалі новыя абавязкі, і, у сваю чаргу, змяняліся адносіны да іх з боку вяскоуцау. Звычаёвае права выцяснялася законамі, інструкцыямі і загадамі. Многія функцыі самакіравання набывалі новае напауненне. Не толькі псіхалогія сялянства як феномен культуры пауплывала на характар самакіравання, але быу, несумненна, і зваротны уплыу.

Адмена прыгону непазбежна прывяла да зменау у дзяржауным механізме самадзяржаунай Расіі. У 60-я гады XIX ст. размова ішла не аб змяненні самадзяржауна-бюракратычнай сістэмы увогуле, а толькі аб уключэнні у гэтую сістэму новых інстытутау самакіравання – сялянскага абшчыннага і валаснога, усесаслоунага земскага і гарадскога. Улада расійскага імператара па-ранейшаму заставалася неабмежаванай, вышэйшыя дзяржауныя установы захоувалі феадальны і пауфеадальны характар, аднак на месцах, разам з органамі дзяржаунага кіравання, былі створаны органы з самастойнай сферай дзейнасці.

Органы сялянскага самакіравання выконвалі шматлікія і разнастайныя функцыі, якія мелі важнае значэнне для сацыяльна-эканамічнага развіцця беларускай вёскі. Гэтыя функцыі традыцыйна ускладаліся на сельскія абшчыны, а заканадауствам 19 лютага 1861 г. былі замацаваны юрыдычна [5]. Функцыянальны дуалізм гэтага уладкавання своеасабліва праявіуся ва усведамленні сялянамі падзелу гэтых функцый на афіцыйныя – тыя, выкананне якіх правяралася каронннай адміністрацыяй, і неафіцыйныя, што тычыліся мясцовых інтарэсау саміх вяскоуцау. Афіцыйная дзейнасць валаснога самакіравання была у значнай ступені бюракратызавана шматлікімі загадамі і інструкцыямі. У савецкай гістарыяграфіі склалася адмоунае стауленне да гэтай акалічнасці.

Аднак такая бюракратызацыя мела і надзвычай важныя наступствы для сялянства. Па-першае, яна паставіла абшчынны лад на юрыдычныя асновы, і такім чынам кіраванне на падставе звычаю замянялася на кіраванне на падставе пісанага закону. Па-другое, сялянская абшчына утваралася як саслоуная карпарацыя сялянства, што з'яулялася моцнай зброяй у барацьбе за свае саслоуныя ці групавыя інтарэсы. Пацвярджэннем гэтага сталі шматлікія скаргі на дзеянні сельскіх старастау, валасных старшынь, суддзяу і пісарау, а таксама міравых пасрэднікау і іншых асоб несялянскага паходжання. Па-трэцяе, дакладнае азначэнне абавязкау абшчыны як афіцыйнай арганізацыі у інструкцыях і

пастановах у той жа час у значнай ступені абмяжоувала самавольства улад гэтымі ж інструкцыямі і уставамі.

Сапрауды, у дарэвалюцыйнай і савецкай гістарыяграфіі склалася адмоунае стауленне да працэдуры валасных сходау. У перыядычным друку таго часу шмат сведчанняу таго, што яны не адпавядалі уяуленням аутарау карэспандэнцый аб ідэале абмеркавання пытанняу. Такі погляд перайшоу і у савецкую гістарыяграфію. Вывучэнне на падставе новых метадалагічных падыходау ходу і вынікау дзейнасці сельскіх і валасных сходау, а таксама адносін самаго сялянства да гэтых органау самакіравання і удзелу у іх дазваляе сцвярджаць, што валасныя і сельскія сходы выконвалі тыя абавязкі, якія на іх ускладаліся і таму дзейнасць іх была у цэлым прадуктыунай. Паступова з развіццём капіталістычных адносін і ростам адыходніцтва адбываўся працэс дэмакратызацыі сходау. З пашырэннем колькасці сямейных падзелау змяняуся склад сходау. Значную ролю у іх сталі адыгрываць маладыя сяляне, аднак матэрыяльны стан іх гаспадарак быу яшчэ недастаткова стабільны. З другога боку, усё большую вагу атрымоувалі заможныя гаспадары. Такім чынам, ішло фарміраванне крыніц сацыяльнай напружанасці вёскі.

Пастунова павышалася роля валасных і агульнаграмадзянскіх судоу, звяртанне да якіх сведчыла аб росце юрыдычнай свядомасці сялянства. Аб гэтым жа гаворыць і рост колькасці спрау, якія вырашаліся у валасных судах. Аднак ускладненне саслоунага складу насельніцтва воласці прыводзіла да таго, што валасныя суды часта не спрауляліся з вялікай колькасцю спрау, што прыносіліся у валасныя суды. Адбывалася значнае павелічэнне колькасці спрау, што разглядаліся у валасных судах. У цэнтральных губернях Расійскай імперыі статыстыка па азначаным пытанні збіралася, чаго не адбывалася у Пауночна-Заходнім краі. Аднак нават адрывачныя звесткі дазваляюць зауважыць тэндэнцыю да росту колькасці спрау, вырашаных валаснымі судамі. У Віленскай губ. яна павялічылася з 1561 у 1871 г. да 2429 у 1876 г. (на 55,6%), а у Мінскай – адпаведна з 3498 да 5885 спрау (на 68,2%) [6]. Разам з тым непісьменныя суддзі, што абіраліся з ліку сялян воласці, не мелі магчымасці і жадання вывучаць агульнаграмадзянскае заканадауства. Таму многія рашэнні гэтых судоу не адпавядалі яго прынцыпам. Гэта прывяло да узнікнення шматлікіх скаргау на рашэнні валасных судоу. Тым не менш гэтыя факты сведчаць аб павышэнні ролі гэтых органау сялянскага самакіравання у сацыяльна-эканамічным жыцці беларускай вёскі. Адначасова паўставала пытанне аб неабходнасці змен у гэтай сферы.

Царскі урад імкнууся да таго, каб з найменшымі фінансавымі затратамі забяспечыць парадак у сельскай мясцовасці. Таму на органы сялянскага самакіравання усклаліся шматлікія паліцэйскія абавязкі, за выкананне якіх адказнасць неслі сельскія і валасныя службовыя асобы. Абавязкі па забеспячэнню грамадскага правапарадку былі звязаны з вялікімі выдаткамі і фінансавымі стратамі, але выконваліся сялянамі у поуным аб'ёме. Такім чынам, гэты аспект у



дзейнасці органау сялянскага самакіравання займау важнае месца ў сацыяльна-эканамічным развіцці Пауночна-Заходняга краю.

Многія абавязкі валасцей і сельскіх вобшчаствау па выкананні земскіх і мірскіх павіннасцей і плацяжоу на працягу дзесяцігоддзяу заставаліся без змяненняу. Сяляне у беларускіх губернях выконвалі шматлікія абавязкі, якія у земскіх губернях раскладаліся на усё насельніцтва. Валаснoе прауленне часта абслугоувала інтарэсы жыхароу, што жылі на тэрыторыі воласці. Аднак яны не ўдзельнічалі ва утрыманні яго службовых асоб і будынкау, карысталіся дарогамі, якія рамантаваліся галоуным чынам сялянамі, паслугамі пошты, сельскіх фельчарау, звярталіся у валасныя суды ды інш. Усе гэтыя установы фінансаваліся галоуным чынам з мірскіх сродкау сялян. Такім чынам, развіццё сацыяльна-эканамічнай інфраструктуры у многім залежыла менавіта ад сялянства. Аднак такі падыход ужо не адпавядау патрабаванням часу.

Арганізацыя апекавання, медыцынскай дапамогі, а таксама стварэнне пазыка-дапаможных кас і утрыманне сельскіх запасных хлебных магазінау значна пауплывалі на сацыяльна-эканамічнае развіццё рэгіёну. Гэтыя аспекты дзейнасці органау сялянскага самакіравання закраналі інтарэсы не толькі сялянства, але іншых катэгорый насельніцтва сельскай мясцовасці, але фінансаваліся таксама сялянамі за вельмі рэдкімі выключэннямі.

Такім чынам, у беларускай вёсцы за парэформенны перыяд набралося шмат праблем, якія неабходна было тэрмінова вырашаць. З развіццём капіталістычных адносін колькасць сацыяльных праблем павялічвалася. Валасная сістэма ужо не магла вырашыць тых складаных пытанняу і задач, што перад ёй ставіліся.

### *Літаратура*


1. Материалы Высочайше учрежденной 16 ноября 1901 г. комиссии по исследованию вопроса о движении с 1861 г. по 1900 г. благосостояния сельского населения среднеземледельческих губерний сравнительно с другими местностями Европейской России. В 3 ч. СПб., 1903. Ч. 1. С. 4, 6; Панютич В. П. Социально-экономическое развитие белорусской деревни в 1861–1900 гг. Мн., 1990. С. 57–58.
2. Обзор Виленской губернии за 1894 г.: Приложение ко всеподданнейшему отчету. Вильна, 1895. С. 11.
3. Нацыянальны гістарычны архіу Беларусі (г. Мінск), ф. 1595, воп. 1, спр. 54, л. 36 зв.
4. Расійскі дзяржауны гістарычны архіу (РДГА) у Санкт-Пецярбурзе, ф. 1149, воп. 13, 1900 г., спр. 82, л. 153; Ф. 1263, воп. 1, ж. арт. 307 і 310, 16 сакавіка 1899 г., спр. 5385, л. 618 зв. – 619.
5. Полное собрание законов Российской империи. 2-е собр. Т. XXXVI. 1861. СПб., 1863. № 36657.
6. РДГА, ф. 1291, воп. 37, 1872, спр. 365, л. 26–27, 36–37, 50–51, 57–59; спр. 366, л. 27–28, 53–54, 82–83, 108–109, 120–121, 159–160, 164–165.